Год II | Субота, 28 студня 1922 г. | № 20 (29)

РАНІЦА

штодзенная грамадзкая, палітычная і літэратурная газэта

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ:
Вільня, Вострабрамская № 4, „Hotel Szlachecki“ пак. № 2.
Рэдакцыя адчыняна што дня, апрача сьвят, ад 11 да 1 і ад 5 да 7 гадз.

Цана нумару 20 марак,
Падпіска на 1 мес. . . 400 марак.
З перасылкай 1 „ . . 500 „
За граніцай ў два разы даражэй.

ЦАНА АБВЕСТАК:
За адзін радок звычайнага друку на 1 стр.—60 м.
ў тэксьце . . . . . . : 75 м.
за тэкстам . . . . 40 м.
Для шукаючых працы на 10 прац. таней.

Вільня, 28 Студня 1922 г.

Бальшавікі некалькі дзён таму апавесьцілі ўвесь сьвет, што карэльскае паўстаньне ужо ліквідована, што ўсе карэльскія паўстанчэскія атрады перайшлі Фінляндскую граніцу, разаружаны і інтэрніраваны...

Але ўсе гэтыя апавешчэньня з‘явіліся наглым лгарствам. Тэлеграмы з Гельсынгфорсу паведамляюць, што карэльскія паўстанцы пачалі наступ, зламалі савецкі фронт і навет занялі горад Алонецк.

Фінляндская прэса з свайго боку паведаміла, што карэльскія паўстанцы добра арганізаваны і ў іх шэрагі прызвана ўсё мужаское насяленьне да 45 гадоў.

З гэтага усяго відаць, што аб ліквідацыі карэльскага паўстаньня няма гутаркі. Гэта такі самы бальшавіцкі „пуф“, які служыць выразным паказчыкам усей іх палітыкі, стараньнем паказаць усяму сьвету справу ня ў тым выглядзе, ў якім яна ёсьць, а ў тым, які ім спадабаецца...

Так было ў свой час з паўстаньнем на Украіне і с паўстаньнем у *Усходняй* Беларусі.

Бальшавікі крычалі, што паўстаньня ў *Усходняй* Беларусі, а пазднеї і на Украіне зліквідаваны, што ўсе паўстанцы раззаружаны, забіты, ўзяты ў няволю і так далей... Аб некатарых атаманах бальшавіцкі урад апавешчаў не адзін раз, што яны растрэляны... Тым часам, дзякуючы Богу, яны жывы і здаровы і да апошняга часу бьюць бальшавіцкіх камісараў і камуністаў.

Сваім лгарствам бальшавікі ашукаюць толькі тых лёгкадумных палітыкаў, якія нічога ня ведаюць, што робіцца на мейсцох—у Карэліі *Украіне, Усходняй* Беларусі.

Мы добра ведаем, што аб ліквідацыі барацьбы там, дзе ідзе о пытаньне сьмерці і жыцьця — ня можа быць ні якой сумлеўкі.

Ні якія канфэрэнцыі, ні якая палітыка ня спыніць гэтай барацьбы за лепшую долю, за будучыну сваей зямелькі, за шчасьце сваіх дзяцей.

✦✦✦✦

ТЭЛЕГРАМЫ.

ЛЬВОУ 27. I. (А. В.). З Украіны паведамляюць, што курс на польскую марку падносіцца. Цяпер за марку плацяць 235 Савецкіх рублёў. Выпушчаны на Украіне новыя грошы. За новы рубель плацяць 10,000 старых савецкіх рублёў.

ЛЬВОУ 27. I. (А. В.). У Праскураве ў апошнія часы былі вялікія бальшавіцкія расправы. Паміж пакараных растрэляны прэзас Земства Мікодым Касіцкі.

МАСКВА 27. I. (А. В.). На зьездзе прэмысловых каапэратываў сьцверджана, што агульная каапэратыўная прамысловасьць у Расеі знаходзіцца ў ўпадка, а з ёю так сама і кустарная прамысловасьць з прычыны малых заказаў. На з'ездзе адзначана, што „Внэшторг“ зрабіў закуп на заказы кустарнай прамысловасьці ў мэце пашырэньня гэтага тавару па Эўропе для рэклямы.

ХАРКАУ 27. I. (А. В.). У Данецкім Цэнтру цяпер страшэннае становішчэ, што да недахвату харчоў. Рабочыя пакінулі капальні і можна спадзевацца, што ў хуткім часе будзе стрымана ўся данецкая прамысловасьць. Безрабоціца і голад сярод рабочых шпарка пашыраецца.

ХАРКАУ. 27.1. (А. В.) Украінская прэса паведамляе аб вялікім заказе паравозаў дзеля Украіны ў Швэцыі. Кажуць, што швэдскія паравозы ня могуць хадзіць на Украіне, з прычыны таго, што жалезныя дарогі ня ўпарадку.

Жалезна-дарожны ўрад адзначыў, што швэдскія паравозы з'яўляюцца цяжкімі, для расейскіх жалезных дарог, і што крытычнае станавішча іх пагражае ў кожнай хвілі катастрофаю.

РЫГА. 27.1. (А В.) Па данясеньням радіо, ў льдох Рыскай затокі зацёрліся нямецкія паравыя маторныя лодкі, ў ліку шасьці. Вызваны лядаколы работа якіх яшчэ ня дала ніякіх рэзультатаў. Дзякуючы таму, што ў затоцэ знаходзюцца яшчэ ня вылаўленыя міны палажэньне матораў небязпечнае. З Кіля на помач высланы нямецкі крэйсяр „Мэдуза“.

НАУЭН 27.1. (А. В.) Камісія кампрамісовая ўстанавіла нямецкую прымусовую пажычку ў суме мільярда марак золатам, замест праэктаваных 40 мільярдаў марак паперовых.

КОУНА. 27.1. (А. В.) Літоўская прэса вельмі нездаволена дзякучы ня атрыманьня запрашэньня на Гэнуэскую канфэрэнцыю праз Ковенскі ўрад. Літоўскія газэты тлумачаць гэта, як рэзультат няпрызнаньня дзяржавамі Заходняй Эўропы Літоўскай Рэспублікі de jure.

КЛАЙПЭДА 27. I. (А. В.) Адбылося пасяджэньне гандлёвае палаты, на якім прадстаўнікі гандлю і прамысловасьці прадставілі польскаму консулу ў Клайпэдзе п. Шароце палажэньне аканамічнае, Клайпэдцкага вокругу ў зьвязку з аднаковымі сыстэмамамі ў справе злажэньня гандлёвае ўмовы Клайпэды з Польшчай.

ПРАГА 27. I. (А. В.) Ужо сфармаваны жалезнадарожны шалон з 40 вагонаў прадуктаў для Расеі.

Гэты цягнік будзе высланы ў Расею ў найбліжшым часе.

Пажар у Польскім Посольсьцве.

МАСКВА 27. I. (А. В.). Учора а 3½ гадз. зрана служыцель Польскага Пасольства ў Маскве быў ўзбуджаны крыкамі, што гарыць памешканьне Пасольства. Сторaж зараз жа ўзбудзіў Мораўскага і ўсех працаўнікоў жыўных ў Пасольсьцве. Адразу прыступілі да хутчэйшага спасеньня архіваў і дакумэнтаў, што было перавезена ў Ангельскае Пасольства.

Пажарная дружына, знаходзючыся вобак ад дому Польскага Пасольства прыбыла на мейсцо пажару, як прайшло бяз малага гадзіна часу пасьля яе паведамленьня, і калі пажар, недапушчаны працаўнікамі Пасольства да канцэлярыі, пашырыўся ў кірунку сэкрэтарыата. У час ратунку, пажарная дружына заліла вадой ўсё памешканьне Пасольства, вада працякла ў сутарэні дзе знішчыла ўсе суфіты, з якіх адзін зусім зьламаны, а іншыя гатовы абваліцца. Прычынай пажару зьяўляецца няўмелае разагрэваньне змарожаных вадацягных труб савецкім тэхнікам. Памешканьне пасольства, дзякуючы пажару засталося зусім знішчаным і няпрыгодным дзеля жыцьця, пасольства хвілёва працуе ў консульскім аддзеле. Дзіўным зьяўляецца тое, што ў той самы час загарэліся на той жа, Паварскай вуліцы дамы камісарыяту Справядлівасьці і францускай інспэкцыі, знаходзючыяся ў значнай далі ад будынка Пасольства і зусім ня злучаныя з ім ні у які спосаб.

✦✦✦✦

Весткі з Варшавы.

У міністэрсьцве заграничных справаў.

Прадстаўнікамі польскага, расейскага украінскага і беларускага ўрадаў падпісана ўмова, якой створана агульная мешаная польска-расейска-украінска-беларуская камісія, маючая заданьнем ліквідацыю ўселякіх гранічных непаразуменьняў і пытаньняў паміж гэтымі дзяржавамі.

Паседжаньня камісіі будуць адбывацца ў Несвіжы і Менску ня меней двох разоў ў месяц (А. В.)

Міністэрства грамадзянскай асьветы апавясьціла дырэкцыі ўсіх польскіх школ аб прыняцьці ўчасьця вучняў ў набожэнствах з прычыны канчыны св. Айца (А. В)

26 студня ў міністэрсьцве заграничных справаў адбылося першае паседжаньне камісіі, маючай на мэце прыгатаўленьне і апрацаваньне матэрыялаў для Гэнуэскай канфэрэнцыі.

На чале камісіі стаў п. Антон Веняўскі, сэкрэтаром Раман Кноль. (А. В.)

Пасол п. Стэфанскі 24 студня меў нараду з савецкім паслом у Варшаве Караханам, аб справах рэпатрыацыі, рэвакуацыі і аб польска-расейскай гандлёвай ўмове.

П. Карахан запэўніў, што рэвакуацыя польскага дабра з Расеі будзе адбывацца паводле парадкам. Яшчэ ў студні павінна быць рэвакуавана тры фабрыкі, некаторыя гістарычныя помнікі і будзе заплачана трэцяя частка кантрыбуцыі. Польскія заложнікі ўжо высланы з Масквы і выпраўлены ў дарогу транспарт з 2.000 палоннымі.

У часе размовы польскага пасла ў камісарыяце заграничных спраў ў Маскве, Карахан заявіў што ён стаіць на грунце хутчэйшага ўрэгуляваньня польска-расейскіх адносін.

Навіны у тры радкі.

З Гэльсынфорсу паведамляюць, што ў працягу некалькіх дзён з боку Кранштата чуецца моцная гарматная кананада кажуць, быццам кананада ідзе паміж батарэяў Чырвонай горкі і Лысага Носа Татлебэнскага форту,—але з якой прычыны—ніхто ня ведае. (Пат.).

У Харкаве Чырвоная армія саўсім здэмаралізована. Чырвонаармейцы ходзюць па хатах і жабруюць.

З Гельсінфорсу паведамляюць, што карэльскія паўстанцы пачалі наступ і савецкі фронт адсунуўся на некалькі кіламэтраў. Глаўны націск паўстанцы зрабілі на Аланецк, які занялі.

Цяпер яны падходзяць у напрамку Рополя. (Пат.).

З Рыгі паведамляюць, што 25 студня адзін з нямецкіх караблёў утоплены савецкім.

Літоўскія газэты паведамляюць: у Коўне меркуюць, што Літва не будзе запрошана на Гэнуэскую канфэрэнцыю з прычыны таго, што яна не прызнана „de jure усімі дзяржавамі. (Pat.).

У Ведні знаходзяцца прыбыўшыя з Амэрыкі прадстаўнікі амэрыканскага консорцыума, якія хочуць арганізаваць у горадзе „дом рулеткі".

З Масквы паведамляюць, што цана на харчы што дзень павялічываецца. 15 студня 1 ф. хлеба каштаваў 19 800 руб., пшэнага хлеба 33.000 за фунт; мука жытняя 535 тыс. рублей за пуд.. пшэнная 1.400 тыс. руб., за пуд; бульба 20 000 руб., за пуд; капуста 3 000 руб., селядцы 32.500 руб., сланіна 102.500 руб., за фунт, масла 120.000 руб., за фунт, цукер 140.000 руб., за фунт, соль 12.000 за фунт, авёс 315 тыс. за фунт. З 18 сьнежня цэны павялічыліся на 200 проц.

ХРОНІКА.

Перад адкрыцьцем Сойму.

26 студня ў палацы адбыўся арганізацыйны сход прадстаўнікоў розных палітычных і грамадзянскіх арганізацыяў, хаўрусаў і таварыстваў, дзеля выпрацаваньня праграмы сьвяткаваньня дня адкрыцьця Сойму.

Выбрана спэцыяльная камісія. Мяркуюць зрабіць дармовыя ігрышча ва ўсіх тэатрах.

Амністня.

У зьвязку з склїканьнем Сойму чакаюць апублікаваньня амністыі.

Кара.

Аштрафованы на 2000 марак гаспадар фабрыкі „Колокол" п. Гінзбург, за тое што не заплаціў грошы у касу хворых.

У камісіі па рэгістрацыі ваенных шкод.

31 студня канчаецца тэрмін падачы заяваў аб звароце маемасьці, вывязенай у 1914 г. з Вільні ў Расею і Украіну.

Арэшт.

26 студня на раніцы пасьля рэвізіі арыштавана Ганна Мустэйкісава.

Спыненьне рэпатрыяцыі.

Згодна пагадоскаў, Рада міністраў пастанавіла спыніць на два месяцы рэпатрыяцыю з Расеі.

Спыненьне зроблена дзеля таго, каб дапраўдзіць да добрага стану этапны пункт у Баранавічах.

Рэпатрыяцыя з Украіны будзе адбывацца як і раней.

Зямельная рэформа у Сярэдняй Літве.

Зямельная рэформа ў Сярэдняй Літве пачала праводзіцца ў жыцьцё ў верасьні мінулага году пасьля абвешчэньня дэкрэту генэрала Жэлігоўскага „o wykonaniu roformy rolnej".

Тэрыторыя, на якую пашыраецца выкананьне гэтай рэформы абыймае 17000 кв. кіламэтраў. Абшар грунту, які можа быць ужыты для мэты рэформы каля 300 тысячаў гэктараў.

Зямельная рэформа праводзіцца ў жыцьцё двумя інстытуцыямі: парцэляцыяй урадоваў і парцэляцыяй прыватнай пад кантролям земскіх уладаў.

Парцэляцыя ўрадовая разбіла на вучасткі 12 двароў з агульнай плошчай зямлі 3559 дзесяцін. Усяго выдзялено 268 гаспадарак, якія ўжо проданы малазямельным сялянам.

Парцэляцыя зробленая Канцэсыйнымі Інстытуцыямі выносіць 2162 дзес. разьбіўшых на 114 гаспадарак Апроч гэтага парцэлюецца яшчэ 9100 дзес.

Прыватная парцэляцыя распарцэлявала 128 двароў 7369 дзес. разбіўшы іх на 291 гаспадарку.

Урадовая парцэляцыя дае найменьшыя цыфры, бо толькі ў апошні час C. U. Z. адтрымаў сродкі на выкуп зямлі, патрэбнай для парцэляцыі—

Агулам у гэтым годзе распарцэлявала 13070 дзес., што складае каля 15 тысячаў гэктараў, разьбітых на 510 гаспадарак.

З 9000 дзес. прызначаныя для парцэляцыі праз упаважнёныя на гэта інстытуцыі палова будзе распарцэлявана ў гэтым годзе і ўся парцэляцыя гэтага году абніме 20 тысячаў гэктараў,

З гетага відаць, што калі парцэляцыя пойдзе такім тэмпам увесь час, дык у 10 гадоў у Сярэдняй Літве будзе скончана ўся зямельная рэформа.

Барацьба з эпідэміямі у Віленшчыне.

Санітарнае становішча Сярэдняй Літвы, быўшае досыць добрым у верасьні і кастрычніку мінулага году, цяпер у лістападзе і сьнежню зрабілася пагражаючым. Гэта відаць з апошніх статыстычных даных.

Напрыклад, хворых на тыфус (плямісты і паваротны) на тэрыторыі Сярэдняй Літвы ў кастрычніку зарэгістравана 130, а ў лістападзе 411 і з іх у адным Вільні 172. У сьнежні лік хворых на тыфус яшчэ павялічыўся. Усяго за сьнежань зарэгістравана на Сярэдняй Літве 819 выпадкаў, ў тым ліку ў Вільні 443. Хворых на запаленьне лёгкіх, гішпанку і шкарлятыну зарэгістравана 300 выпадкаў.

Даведзена, што заразныя хваробы пашыраюцца дзякуючы ўцекачом, якія прыезжаюць з Саўдэпіі ўжо хворымі і разносяць заразу па ўсей Сярэдняй Літве.

Дэлегатура М. М. К. пасьпешае ўсюды з лекарскай і санітарнай дапамогай, камандзіруючы ў мейсца эпідэмій ня толькі дактароў, фэльчароў і мэдыкамэнты, але пасылаюць туды і вопраткі і белізну.

Немалай прашкодай для санітарнай дапамогі з'яўляецца брак будынкаў. У мейсцох эпідэміі няма памяшканьняў для адкрыцьця шпіталяў, што змушае хворых месціцца разам з здаровымі ў вясковых хатах.

Напрыклад у Смаргонях, зьнішчаных да чыста яшчэ ў часе вайны, саўсім няма памяшканьняў.. Хворых на тыфус прыйшлося перавозіць у горад Ашмяну.

Пагражае эпідэмія тыфуса і Вільні, бо заразная бальніца ў Звярынцу не магла ўмясьціць усіх хворых. Але ў апошні час дэлегатура М. М. К. атрымала значныя грошы, і будзе мець магчымасьць пашырыць бальніцу у Звярынцу і санітарную дапамогу ўсей Віленшчыне.

Дзякуючы кепскім эканамічным варункам і аслабленьню з прычыны вайны сьмертнасьць сярод хворых вельмі высокая, яна дасягае да 10 пр., пры нармальных варунках 3 пр.

Віленская дэлегатура мае на тэрыторыі Сярэдняй Літвы і Навагрудзкага Ваяводзтва 21 шпіталь з 1500 ложкамі.

Хворыя ўцекачы, прысыланыя ў шпіталі адміністратыўнымі ўладамі, лечацца дарма, а пазасталыя плацяць 400 марак што дзень. (W. A. P.)

Тыпы Палесься.

2. Старая канава.

Як толькі праменьня сонца заігралі ца кроплях брыльянцістай расы, адразу падняўся цэлы канцэрт на розныя галасы лясных птушак. Ганчар йшоў наперадзі зняўшы шапку. Відаць была, што ён слухаў песьні птушак і радаваўся сонцу разам з імі.

Мы йшлі берагам старой канавы. Усё дно канавы было зарошчы асакою і сітнягом, па якому лёгкі вецярок гнаў прад намі хвалю за хваляй. Ч сямі з яго запамацеўшы вылятаці качкі і з крыкам няслiся ўдоўж канавы, сядалі ў нявідную воду, зноў зрываліся, зноў падалі. Ні я, ні Ганчар з Карабай ня думалі страляць. А Ганар навет раззлаваўся, што качкі ўцекалі ад яго ў такі маліцьвены яго настрой, калі навет ён забыўся, што за плячамі ў яго вісіць стэльба. Часамі галіны асін, вольхаў і бяроз так моцна пераплятаціся над канавай з абодвых яе берагоў, што ня было відаць неба.

„Хто рабіў гэту канаву?" задаў я ім пытаньне.

— „Хто рабіў?"перапытаў мяне Караба. „А бачыце яна ідзе ад старога замку, сьледу ад якога навет ужо і ня засталося, а вось пабачыце самі..."

Ішлі далей моўчкі. Усё часьцей і часьцей схіляліся да нас галіны дрэў і на астатак мы йшлі скрозь зялёны тунэль.

Прабірацца па высокай траве было цяжка, і мы часта застанаўліваліся адпачываць. Так ішлі мы аж за паўдзень.

— „Зарас будзе паварот; дык вось і ўбачыце тры крыжы! Тутака мы і адпачынем," мовіў Караба.

І праўда, праз крокаў 500, канава рабіла круты заварот, і зялёная заслона, якая вісела над намі згінула. Па абодвых берагох канавы стаялі густа ёлкі.

— „Глядзіце, вось сюды!" застанавіў мяне Караба, паказываючы кудысь рукою.

Я зірнуў туды і ўгледзіў сярод гушчару ёлкаў тры вялікіх, пакрытых зялёным мохам крыжы.

Я стаяў і глядзеў.

Дзяргач.

Маленькі фельетон.

„Паказчыкі праўды".

У апошніх днях ў Парыжу пачынае выдавацца газэта „Нацыянальнае Эха", дзе абяцаюць „паказаць грамадзянству праўду".

— Грамадзянства—кажэ газэта:—ніколі ня ведала праўды. Грамадзянства і цяпер ня ведае яе, бо ад яго хаваюць праўду! Але-ж мы яе пакажам: гэта наша першая мэта!—

Так кажэ „Нацыянальнае Эха", газэта Клемансо. Таго самага Клемансо, які ў апошні час меў няўдачу ў сваёй палітычнай працы.

Ня ведаем, ці споўніць ён сваё абяцаньне, ды і наагул гэта нас мала цікавіць: што мы яму і што ён нам? Цікава адно: агульная псіхалёгія "пацярпеўшых няўдач", а такіх і ў нас шмат, куды ні паткніся—двох, трох а то і чатырох. І ўсе яны падобны адзін да другога, ўсе, як той кажа, на адно капыло робляны".

Пакуль сядзіць чалавек на пасадзе, пакуль яму асабіста шануе—ўсё добра, ці, кажучы славамі „Нап. Эха": ўсялякая абмылка тлумачыцца, як удача і „грамадзянства ня можэ сьцяміць чаму пры гэтулькіх удачах, аб якіх, навет, ў газэтых крычэлі. ў рэшце выходзіць поўнае банкруцтва"?..

Так ідзе, пакуль чалавек сядзіць на пасадзе. Але-ж як толькі яму асабіста не пашануе, як толькі ад яго адабралі партфэль—ў той самы момант ён пачынае крычэць аб тым, што „пакажэ праўда!"... „Растлумачыць якога сорту былі тыя ўдачы, аб якіх грымелі газэты"... і г. д.

Распаліўшыся ляціць ў рэдакцыю найвялікшэй газэты з цэлай торбай рожных „паясьненьняў" і „даказацельстваў", якіх пабольшасьці там сусім ня прымаюць...

— Што рабіць? — пытаецца чалавек ў самаго сябе, выскачыўшы з рэдакцыі, палаяўшыся там з ўсемі і сказаўшы некалькі слоў аб „тайных ворагах" і аб „агульнай падкупнасьці".

— Што рабіць?—разважае ён далей: Добра, каб, як ў Клемансо, было шмат грошаў ў кішэні—тады чаму-ж не адчыніць свайго „Эха"?... Але-ж грошаў няма!.. Што-ж рабіць?.. Ня кідаць-жа „праўду" ў печ?..

— Хіба пайсьці да знаёмых і расказаць ім на славах, каб хоць яны ведалі... А можа ад іх і яшчэ хто даведаецца... А тамака ад тых яшчэ і яшчэ. „А тамака"...

Ня скончыўшы думкі чалавек ўжо ляціць да знаёмых і шыпіць, шыпіць бяз канца і краю:

— Той злодзей, той—басяк; гэты—недапёка нейкая; гэты—крупель... і г. д.

І слухаюць бедныя знаёмыя, ня ведаючы што рабіць, па некалькі гадзін падрад, „паясьненьня". Слухаюць, пакуль не заснуць ад нуды, а ачнуўшыся зноў слухаюць і думаюць: «Што-ж? Пацярплю яшчэ трохі, гэта—агульная псіхолёгія ўсіх „эбражаных" ўсё роўна ці паляк ён, ці француз ці наш брат-беларус»...

Ен бардзэй згодзіцца адрачыся ад жыцьця, як ад лаянкі... Што-ж рабіць? Пацярплю!"..

Так разважаюць знаёмыя і ніхто з іх не натрапіўся на думку адказаць „няўдачніку" адкрыта ў вочы:

— Чаму ты так позна зьявіўся са сваімі асьведчэньнямі? Дзе ты быў раней?... Ці не сядзеў даўней і ты разам з тымі, каго цяпер лаеш? Ці ня пеў ты тое самае, што й яны?.. Вось каб тады, маючы ў сваіх руках ўладу, каб ты тады, кажу, зьвярнуўся да нас і пачаў крычэць аб гэтым—мы бы, пэўна, цябе падтрымалі і не далі-б зваліцца, а стараліся-б як наймацней умацаваць цябе на тваей пасадзе, на агульную карысьць грамадзянству!.. Але ты тады маўчаў і, разам з імі дурыў нам галаву аб „агульным дабрабыце"... Ты галосіш цяпер, як цябе скінулі с пасады?.. Дык не! Ты нас не ашукаеш! Мы ведаем, што мэта ў цябе не агульна-грамадзянская карысьць, (яна служыць толькі заслонкаю) а твая, асабістая карысьць! Шляхам лаянкі ты дамагаешся папулярнасьці пэўнага дзеяча, каб мы, на сваіх плячох, далі тябе магчымасьць зноў ўбіцца ў даўнейшы гурток!.. Не! Ідзі ад нас!.. Усім вядома, што калі праз сваі лаянкі цябе не пабьюць, не трапіш у турму, не памрэш ад паляруша ў патэтычны момант а зноў зробішся „ягомосьцям з партфэлям"—ў той-жа момант ты змоўкнеш. Гэдкая ўжо натура ў вас, „ягомысьцяў бэз партфэляў!"

Антон Шуляк.

Рэдактар-Выдавец: Вацлаў Адамовіч

Друкарня „Друк" Субач 2.